Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрації: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к,, на 6 мес.—1 р 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праудзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакції. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 1 (13) сакавіка (марца) 1912 г. № 9.

## За апошні тыдзень.

### З Расеі.

Быўшаго таварыша міністра ўнутрэных спраў, Курлова, быўшаго начальніка кіеўскай „ахраны“, Кулябку, начальніка палацовай ахраны, Спірыдовіча, і Верігіна пастаноўлена аддаць пад суд. Гэтые людзі, каторым далі ў рукі аграмадную ўласць і паставілі пільнаваць ў гасударстві парадку, як аткрыла рэвізія сэнатара Трусевіча, самі той парадак нарушалі, самі пераступалі законы, ня дзіва, што ўсё грамадзянства с цікавасьцю будзе чэкаць прыгавору суда...

Справа быўшаго манаха-ксендза Мацоха і яго таварышоў ўжо скончылася. Мацоха за ўбіўства, кражу грошэй і ашуканства засудзілі на 12 гадоў ў катаргу; палюбоўніцу яго, жонку яго брата, ім жэ забітаго,—на два гады ў вастрог. Быўшых манахоў Старчэвскаго і Олесінскаго—за кражу грошэй—на 5 і 2 с палавінай гады у арэштанцкіе роты. Такі канец гэтай страшэннай справы.

„Каму больш дадзена, таго і атказ будзе больш“. Гэтак верыць народ. І калі несумленнасьць, ашуканства, нарушэньне законоў і душэгубства, так часта цяпер можна спаткаць ў вышэйшых станоў, дык для іх народ дамагаецца і цяжэйшай кары. З гэтым лічыліся судздзі Мацоха і павінны лічыцца тые, што будуць судзіць Курлова, Кулябку і др.

У мінулым тыдні ў Пецербурзі адбыўся з'езд партіі „націоналістоў“. Цікава, чым займалася гэта партія, каторая дабіваецца, каб ей далі камандаваць і ў Думе, і па ўсей Расеі. Вось на самым пачатку з'езд пастанавіў паклапаціцца аб тое, каб Сынод прызнаў сьвятым патрыарха Гермогена, каторы памёр 250 гадоў таму назад. Далей разбіралі справу аб выбарах ў Чацьвёртую Думу і аб «інородцах». Ненавісць да людзей, каторые толькі ў тым і вінаваты, што належаць да другой націі, відаць была ва ўсіх пастанаўленьнях. Толькі тых гатовы палюбіць «націоналісты», каторые прызнаюць, што ў Расейскім гасударстві расейцы павінны *панаваць* над «інородцамі», а тые маюць адно право *служыць* ім... «Інородцы» не павінны глядзець на Расею, як і на *свой* край: яны, значыць, павінны чуць сябе тут толькі гасьцямі! Асабліва-ж напаў з'езд на украінцоў і беларусоў: ён накладае клеймо «здрайцоў» на ўсіх «украінцоў-мазэпінцоў і беларускіх сэпаратыстоў» за тое, што яны старанюцца развіваць *сваю* націанальную культуру—украінскую і беларускую, не чэкаючы, пакуль паны «націоналісты» ласкава пазволяць ім карыстаць с тэй культуры, якую вытварыў вялікарускі народ і расейская інтэлігенция *для сябе*.

Пакуль ідуць суды, пакуль «націоналісты» прыдумляюць новые способы, каб ціснуць «інородцоў» бытцым то дзеля карысьці расейскаго народу,—народ той маўчыць і... галадае, а ад голаду хварэе, вымірае. У Уфімскай губэрні ад недаеданьня ад 1 грудня да 15-го января захварэло на тыфус 2.084 душы. Расейскае грамадзянство стараецца, чым можэ, памагчы селянам, у Пецербурзе быў назначэн «дзень коласа жыта», і ў гэты дзень за каласы житніе, каторые прадавалі на вуліцах, і на кватэрах, сабралі с публікі 150 тысяч руб. на хлеб для галадаючых. Але «націоналістам» гэта не падабалася: яны кормяць народ ня хлебам, а ненавісьцю чэлавека да чэлавека. І вось дэпутат Марков 2-ой аблаяў ў Думе галадаючых «лодырамі», а газэта «Новое Время» накінулася на тых, што збіралі на хлеб для галадаючых, кажучы, бытцым між імі былі людзі, каторые карысталі з сабраных грошэй для сваіх спраў.

Гэтакай нягоднай брэхнёй хочуць «націоналісты» закрыць ад народных вачэй тое, што самі яны для народу нічога ня робяць; «работа» іх—вельмі ўжо «цёмная».

## У Думе і каля Думы.

Неяк німа згоды між Думай і Гасударственным Саветам. Рэдка-рэдка закон, зацьверджэны Думай ды ёй жэ напісаны, праходзіць праз Савет ў цэласьці, а то іх больш зусім адкідаюць. Гэтак і цяпер Гас. Савет пастанавіў пакінуць на далей валасны суд, каторы Дума манілася скасаваць, як зусім непрыгодны для жыцьця,—хаця-ж Савет—пагаварыўшы тры дні—прызнаў, што Дума справедліва адбірае судзебную ўласць ад земскіх начальнікоў, і пастанаўленьне яе зацьвярдзіў.

С Холмскай справай, здаецца, ўжо скончылі. Ды выходзіць, што з новаго закону ніхто не рад: націоналісты і правые, каторые новым законам хацелі урэзаць правы жыдоў і палякоў, нездаволены, бо Дума той пункт выкінула; палякі-ж злуюць, што Холмскую губэрню аддзялілі ад Польшчы, і лічуць гэта для сябе крыўдай, значыць, той ўвесь закон нікому ня быў патрэбен, і Дума зусім дарма страціла на прагляд яго гэтулькі часу.

Цікава была справа аб цукры. Дума, ня гледзячы на пратэсты міністра фінансоў, пастанавіла паменшыць акцыз на цукер: каб заместа 1 руб. 75 к. бралі с пуда 1 руб. Гэтак цукер павінен патанне́ць на 1—2 кап на фунце, калі Савет закон той зацьвярдзіць, і Гасудар падпішэ.

Многа гутарылі ў Думе аб унівэрсытэцi і тлумачылі, што палітыка цяперашняго міністра Кассо пярэчыць законам ды толькі дражніць студэнтоў. Ізноў жэ левые дэпутаты востра нападалі на думскую камісію, каторай загадывае барон Тызэнгаўзэн і каторая павінна была даўно ўжо апрацаваць закон аб найме служачых ў гандлю, але нічога дагэтуль і ня думала рабіць. Дума загадала камісіі, каб закон быў гатоў праз 14 дзён.—Відаць, перад канцом заседаннёў «акцябрысты» хочуць паказаць, што яны вельмі рупяцца аб працоўнікоў уселякіх, ды гэтак прыцягнуць рабочых і прыказчыкоў на свой бок у часі новых выбароў.

### З заграніцы.

Забастоўка англійскіх углекопоў, на каторую перш шмат хто не звертаў вялікай увагі, цяпер трывожыць блізка ўсе дзержавы. Вугаль—гэта фундамэнт ўсіх фабрык і заводоў; каменным вуглем паляць печы ў паравозах, ад яго бяруць сілу параходы. І даволі углекопам сказаць: „годзе, не працуемо болей!“—каб заціхлі фабрыкі, задзержаліся машыны, перэсталі падвазіць уселякіе тавары параходы. Ваенны флот—веліканы броненосцы—без вугля нічога ні варты: гэта—жывые трупы...

Праўда, ў Англіі ешчэ ёсць запас каменнаго вугля, каторы гадамі дабывалі з зямлі тые-ж рабочые-забастоўшчыкі. Але яго хопіць не надоўга. Тады ня толькі ўсе фабрыкі пазакрываюцца, ня толькі перэстануць хадзіць поезды і параходы,—але і ўся сіла Англіі, каторая дзержыцца на найвялікшым ў сьвеці флоце ваенным, прападзе. Ці не накінуцца тады на яе суседзі-ворагі, каб безбаронную зваеваць?

Гэткая думка сама можэ прыйсьці кожнаму ў галаву, чытаючы аб тым, як мільён англіцскіх рабочых, кінуўшы працу, дабіваецца для сябе лепшаго жыцьця, лепшых заработкоў. Але той страх—пусты. Рабочые ўсіх краёў ў змаганьні с капіталістамі дзержацца ўсе разам, бытцым адна семья. І вось ўжо бачым, як адбіваецца англійская забастоўка ў іншых краёх.

У Немеччыне, каторая адна магла бы памкнуцца на вайну з Англіей, карыстаючы з забастоўкі, між рабочымі-углекопамі падняўся вялікі рух. У Вэстфаліі адбылося заседаньне, на каторым прэдстаўнікі правіцельства стараліся згаварыцца з дэпутатамі ад рабочых, каб тые не рабілі забастоўкі. Рабочые сказалі, што яны лічаць цяперашні момэнт для сябе дужа карысным: калі яны пакінуць даставаць вугаль з зямлі, дык таго вугля ніаткуль і ня выпішэш, бо найбольш яго давала Англія, а цяпер і там німа! Вось, рабочые і ставяць такое жаданьне, якое паставілі англійскіе таварышы іх: фабрыканты павінны павялічыць ім плату за работу. Калі-ж з добрай згоды гэтаго ня зробяць, дык праз колькі дзён 150 тысяч углекопаў кінуць работу. У нядзелю у Рэйнскім Окрузе было 60 сходоў рабочых.—Апрача ў Вэстфаліі і на Рэйне, чэкаюць забастоўкі і ў Сілезіі. А як ня будзе вугля, дык і ў Немеччыну перакінецца тое, што цяпер бачым ў Англіі.

У Франціі, Бэльгіі, Аўстрыі, Гішпаніі — ўсюды заварушыліся углекопы. Чэкаюць забастоўкі і ў Амэрыцы, ды ўжо фабрыканты робяць у сябе вялікіе запасы каменнаго вугля. Кажуць, што пачатак амэрыканскай забастоўкі назначэн на 1 апрыля.

Вельмі спакойна ідзе забастоўка у Англіі: ніякіх беспарадкоў, бойкі і т. п. німа тутака. Гэтак высока стаіць культура ў англійскіх рабочых, і нават ворагі іх ня могуць не дзівавацць, як спакойна і абдуманна вядуць яны сваю справу. Паліціі, войску німа тамака ніякай работы. І можна мець надзею, што углекопы—такі дабьюцца свайго: іх хаўрусы з дробных складак рабочых прызапасілі на чорную гадзіну аграмадны капітал, і пакуль-што на жыцьцё ім хапае. Усё-ж гэта некрывавая вайна працы с капіталам скончыцца ня скора.

Ніяк ня можэ скончыцца і другая вайна, але тая вельмі крывавая. Гэта—між Італіей і Турціей. Так сама ў Кітаі, хаця Богдыхан адрокся ад ўласьці, і кітайцы завялі у сябе рэспубліку з выбарным прэзыдэнтам,—ня скрозь прэдстаўнікі стараго парадку паддаюцца новаму правіцельству. Асабліва дзержыцца стары лад ў Манджурыі, аткуль родам богдыханава семья. Тут вайна ўсё ешчэ ідзе. Гэтак і Монголія ўсё хочэ аддзеляцца ад Кітаю, бо на гэта яе падбіваюць другіе дзержавы; але тут ёсць надзея, што ізноў згода с Кітаем наладзіцца.

## Іх „праўда“.

Розные „націоналісты“ і нанятые „патрыоты“ паднялі апошнімі часамі цэлую аблаву проці беларусоў, толькі заместа звычайнаго аблаўнаго крыку „ага-ту!“, ага-ту! „кусі яго“! сыплюцца ў чоранасоценных газэтах крыкі: „сэпаратызм“, „сэпаратысты“, „мазэпінцы“, „польская інтрыга“!

Гэта прыпамінае нам двух людзей с каторых адзін ляжыць звязаны па руках і нагах, а другі стаіць над ім с палкай. І чым больш той звязаны маўчыць аберэгаючы свае сьветлые ідэалы, тым той чэлавек, што стаіць над ім с палкай, больш раз'юшываецца, больш зьвярэець. Яго злосць душыць. Яму хочэцца у гэтаго зьвязанаго, нявольнаго, маўчліваго, пакорнаго чэлавека выдзерці ўсё чыстае, сьветлае, дый ўсіх зрабіць такімі ж прадажнымі і благімі, як сам. Яму хочэцца, каб гэты зьвязаны пачаў так, як ён, с пенай на вустнах кідацца, каб стаўся шалёным. Але зьвязаны маўчыць... Ня выбіўшы-ж ні благога, ні фальшываго слова з маўчальніка, пачынае „чэлавек с палкай“ гаварыць брэхню і не праўду ад *яго* імені.

Вось, 14 студня гэтаго году „Виленскій Вѣстникъ“ пад знакам пытаньня памешчае такую заметку:

> У выдаванай у Вільні на беларускай мове што-тыднёвай газэці „Наша Ніва“ чытаем вось такіе словы (№ 47):
>
> „Сягоньня адзін наш знаёмы пачатковы вучыцель расказаў нам, што у яго ў школі ксёндз-законавучыцель горача даводзіў, што ўсё-ж такі, ў канцы канцоў, тутэйшае сельскае населеньне, званае беларусамі, пойдзець за палякамі а тады гэты край напэўна станецца польскім, а не расейскім“.

Нашы чытачы маюць № 47 з 1911 года, бо аб гэтым тут мова, а шмат хто мае і с чатырох папярэдніх гадоў гэтые нумэры, ніхай паглядзяць ці там дзе хоць што

## Гульня „Курылка“.

Падчас вечарніц на вёсцы даўней паміж іншымі гульнямі дзяцюкі і дзеўкі гулялі ў „Курылку“. Усе садзіліся ў кружок, запалівалі лучыну (курылку) і, перадаючы яе з рук у рукі, пеялі гэтакую песеньку:

Жыў недзе курылка,
Жыў недзе курылка,
Ды не памёр.
Ай, якіе у курылкі
Ножкі цененькіе
Душа караценькая!

Не памры, курылка,
Не памры, курылка,
Ды мне маладзенькай
Не прыкзывай скакаці,
Ды мне прыгожэнькай
Не змушай гуляці.

У гэтай гульні лучыну трэба было хутка перэдаць суседу, каб не пагасла. Ў каго лучына пагасла, той павінен быў, або запеяць песьню, або танцаваць і пры гэтым даць нешта новае, чаго ешчэ ў гэты вечар не было. Калі хто с хлапцоў або з дзеўчат ня мог гэтаго споўніць, таго каралі: хлопца дзеўкі білі пугай, дзяўчыну хлопцы білі паяскамі.

Са слоў старога дзеда с-пад Зембіна (Мінскай губэрні) запісаў ў 1908 гаду

*Ромуальд Земкевіч.*

## Журба.

Сэрцэ болей не сьмяецца,
Сэрцэ плачэ жаласьліва.
Ці дасць Бог, ці давядзецца
Быці там, дзе наша Ніва?

Думкі, праца—ўсё далёка!
Песьні, казкі ў пазабыцьцю..
Прад сабой я толькі вока
Бачу страшнаго нябыцьця.

Волі, думак, шчасьця, сьмеху
Дайце мне! Хоць пакажыце!..
Але не... Мне на пацеху
Вока страшнаго нябыцьця.

Я-б узяў машыну ў рукі,
Карчаваў-бы, чысьціў поле,
Але там... Я тут бязрукі,
Я бязсільны... Я біз волі.

Сэрцэ плачэ і я плачу;—
Плачу з сэрцэм галасьліва.
Дзе ты, дзе ты, краю родны?
Край далёкі, маці-Ніва!

**Алесь Гарун.**

## З Беларусі і Літвы.

*(Ад уласных карэспандэнтоў).*

**Мінск.** Сюды ў помач архіерэю Міхаілу назначылі вікарнаго епіскопа, о. Іоана, рэктара віленскай духоўнай сэмінарыі. Ён будзе жыць тут ў Сьв.-Духоўскім манастыры, ў каторым ўжо ачышчаюць для яго кватэру; манастыр так запушчэн, што на гэту работу архіерэйская кантора павінна была даць 3.000 руб. Манахі вельмі з гэтаго рады; яны маюць надзею, што пры о. Іоане будзе у іх лепшы парадак, лепшые харчы, ды чысьцей. Харчы дагэтуль выдавалі ім скупа, бо манастырскіе грошы ішлі на другое.

Як пішэ „Мін- Сл.“, новы владыка вельмі любіць займацца „палітыкай“. Ці ня выйдзе з гэтаго конкурэнціі між ім і еп. Міхаілам? І так ужо даўно ідзе конкурэнція між „архіерэйскай“ партіей і партіей губэрнатара; абедзьве рыхтуюцца да выбароў у Чацьвёртую Думу, ды кожная цягне сваіх кандыдатоў. За кандыдатоў „губэрнатарскай“ партіі, каторые будуць аб'яўлены толькі ў апошні момэнт —перад самымі выбарамі, агітацыю павядзе адміністрація: земскіе начальнікі, паліція; кандыдатоў архіерэя паддзержыць ўсё духавенство. Значыць, тут будзе праўдзівая вайна!

*Мікола Камароўскі.*

**Жортай,** Мінск. губ. Барысоўскаго пав. Краснолуцкай воласьці. Сягоньня 14 лютаго ў хлеўчыку на бэлечцы павесілася адна кабета (гадоў 35 ей было) і пакінула трое дзетак. Яна, бачыце, дужа хварэла вачыма; так, ў пачатку гэтай зімы саўсім зрок утраціла, а яе ўся радня разам з мужыком замест лячыць хворую, а посьле калі асьлепла, заміж пацешаць, чым мага, адно здзекаваліся скрозь з яе, як які скот бязмозглы, ці нават горш таго. Тая йшчэ ў восень парывалася разоў колькі налажыць на сябе рукі, ды ўсё не удавалося.

*К. Качанец.*

**Г. Дзісна,** Віленск. губ. Вось мы прычэкалі нібытцым-то і вясны; хоць ешчэ наша Дзьвіна стаіць, але ўжо скоры той час, калі лопне лёд і крыгі за крыгамі паплывуць і растануць, а на ганках, пахнучых сьвежай смалой, паліецца гаротная, сумна —закацістая песьня „сяка“ (гэтак называюць у нас беларусоў с-пад Вяліжа і з Смаленскай губ.); залучае працяжная каманда „корніка“ а-а-тбі-вай! Заскрыпяць на ганках цяжкіе „дрыгаўкі“, налягуць худые грудзі... Гэтак сама у нас тут і з беларускай справай: глянеш—замарожэна ўсё скроз, грубы лёд ляжыць! Але, калі павядзеш ноздрамі ў паветры, чуваць вясной! Чуваць, што набліжаецца нешта жывое, радаснае, сьветлае... Праўда, што маем мы ўжо і тут сваіх ворагоў, каторые рады-бы былі утапіць нас ў ложцы, але беларус пасьпеў да гэтаго прывыкнуць і не шманае... Вось, хоць-бы сёлета: выпісала тутэйшая супольная „шля хоцкая“ крама беларускіх календароў на продаж, дык гэта адразу кольнуло ў вочы тутэйшым паном, а асабліве пані М—скай, каторая зара падняла гочан, каб ў той-жэ час прыняслі с крамы календары, а то яна возьме свае грошы, якіе дала на супольную краму. Мала гэтаго, с прычыны беларускаго календара быў цэлы панскі сход. у Дзісьне. Адным словам, календару беларускаму у Дзісьне некаторые тутэйшые паны зрабілі акуратны байкот, і яго праз гэта сёлета менш прадалося, чым летась.

І тутэйшые „істінные палякі“, ускаламуціўшы ваду, пякуць сваю пячонку: яны ціхачом перэрабляюць на „палякоў“ нашых цёмных людзей, перэцягіваючы іх на „панскую“ мову, робячы іх разьюшэнымі ворагамі беларушчыны. А ўсё-ж і гэта не паможэ: кажу, чуваць ужо ў паветры, што весна набліжаецца! Што лепшая, справядлівейшая тутэйшая маладзёж пачынае ўжо шырэй глядзець на жыцьцё і яго патрэбы.

*Задзісенкавіч*

**Ст. Чорная Весь.** Каля самаго вагзалу тут ёсць казённая зямля. Арэндуюць яе ўжо 40 гадоў селяне беларусы каталікі. Цяпер гэту зямлю казна прадае, але не арэндатарам-беларусам, а стараверам перэсяленцам. Арэндатары хацелі аткупіць гэту зямлю, але казна не хацела ім прадаць затое, што яны каталікі. Куды яны ні пісалі просьбы, нічога не памагло: ўсюды адзін атказ. Скора гэтых селян згоняць з іх бацькоўшчыны з ўсім дабром, з будынкамі, якіе яны тут мелі.

*Ворач.*

**Чорнаўская** воласць Гродзенск. губ. Быўшаго старшыну нашай воласьці прысудзілі на два годы ў турму за тое, што вымагаў рубля грошай у селяніна Семеняка.

*В.*

Сяло **Хоміно,** Могіл. губ. Горэцк. пав. У оршанскім і у горэцкім паветах раз'еджаюць аграномы і навучаюць селян, як трэба вясьці гаспадарку, паясьняючы свае гутаркі сьветавымі малюнкамі. С 17 да 19 лютаго горэцкі аграном п. С—кій гутарыў у вёсцы Белі. Селян пры гэтым было не шмат. Лепей усяго падабаліся ім гутаркі аб садах, жывёлі і многапольнай сыстэмі. Восем хутарцоў запісалося ўвясьці многаполье.

= На днях пачынае працаваць „Пазычкова-зберагацельнае таварыство дробнаго крэдыту“ Хлыстоўскай воласьці. Як ведама, гэта добрая рэч, бо селянін у цяжкіх варунках абеспечан ад квотнікоў-кулакоў, а пры дастатку—ад злодзеёў.

*Саука Кавалъ*

## ПРЫ КУДЗЕЛІ.

Унесла баба кудзелю,
Ды нечым ўвязаці,
Пашукала-бы шнурочка,
Ды нескуль ўзяці.

Села яна падумала:
„Што маё за шчасьце?
„Маю воўну, маю лёну,
„ А німа як прасьці!

„Ты чаго, Міхась, разсеўся?
„Выйшоў-бы ў сені!“—
Закрычала мужыку
Жонка з усей сілы,

„Атчапіў-бы ты шнурочэк
„Ад тае калыскі,
„Што валяецца ў кутку
„Каля року бліска!“—

Мужык жонцы ані слова...
Выйшоўшы ў сені,
Падае ён ей вяроўку,
Вітую із хмелю.

Баба й гэтым не ганьбуе:
Звязуе кудзелю,
Адно той шнурок парваўся,
Ведама, як с хмелю.

Як ўхопіць жонка хмель той,
Давай мужа біці!
—„Што-ж я, бедна, нешчасьлива,
„Буду зноў рабіці?

„Ідзі, дурню, ты ў гумно,
„Вазьмі ты вяроўку
„І, развіўшы на часьціны,
„Дай мне адну стволку!“—

Міхась доўга не спрачаўся,
Ўзяў ключы с паліцы;
Атчыніўшы ён гуменцо,
Забыў, што рабіці?

Доўга жонка яго ждала,
Дай сама пайсьці;
Увайшоўшы ў гуменцо,
Ну за лоб трасьці!

—„Ах, ты, гіцлю, стары чорце,
„Каб ты акалеў,
„Як я дзень той змарнавала!
„Каб хто паглядзеў,

„Што я сёньня нарабіла?!
„То-ж ноч настае!...“
Плюнула яму у вочы...
„Гэта, кожэ, праз цябе!!!“

**І. Пабудзей.**

---

Украдкам, каб бацька не ўбачыў, ўлажыў Габрусік па два пальцы кожнай рукі у губу і... зычны, закацісты сьвіст раздаўся пад высокім скляпеньнем царквы...

Перэпужаліся людзі; поп перэстаў маліцца.

Што гэта? Хто гэта?!

Але Габрусік ўжо даўно сарваў ланцёнкі з ног і барджэй кінуўся на ўцекі дамоў...

А хрысьціяне і не дагадаліся, што гэта была першая шчырая малітва малога Габрусіка у царкві...

**Зьмітрок Бядуля.**

## Мікітоў француз.

Гэта было 100 гадоў таму, ў 1812 гаду. Што гэта было, я не сумневаюся, бо чуў ад старых людзей, каторые добра ўсё гэта ведалі... Тады праходзілі праз нашу старонку французы, ідучы на Маскву.

А як яны прахадзілі праз Беларусь, то нашы селяне хаваліся ў лес. Гэтак было і ў Слабодцы. Калі ўжо французы перайшлі народ пачаў варочацца з лесу і пустые, сьцюдзёные хаткі напоўнілі ся людзьмі.

У Мікітавай хаці палезла маладзіца пад печ даставаць курыцу, каторая уздумала квактаць аб гэтай пары,—ды як закрычыць:

— Ратуйце, людцы! хранцуз пад печчу!...

Узняўся гоман. Сабраліся селяне с тапарамі, с каламі, бабы — с качэргамі, кісялёўкамі і вілкамі, ды сяк-так выцягнулі с-пад печы збялеўшаго, як палатно, французскаго салдата.

Людзі абступілі кругом француза і цікава угледаліся на яго. Нікому і ў галаву не прыйшло забіваць яго: тапары, калы ды качэргі пабралі яны, каб бараніцца, бо думалі, што гэта француз будзе нападаць.

— Але-ж ён спудзіўся, бедак!— заўважыў Мікіта.

А другіе, успакоіўшыся, пачалі жартаваць і сьмеяцца:

— Бачыце, якога малайца курыца высядзела!—сказаў адзін:

— Толькі худы вельмі!—дакінуў другі.

— Гэта маладзіцы на места Хвёдара мужык знайшоўся!—сьмеяўся трэйці.

— Але ён паўне галодны, бедненькі!—забедавала баба.

— Пэўне, што галодны,—згодзіліся мужчыны.

— Ну, гаспадар, — звярнуліся да Мікіты: чым будзем госьця частаваць?

— А чым хата багата...

Маладзіца, тая самая, што знайшла француза, паставіла на стол міску з вадой і накрышыла хлеба. Сеў Мікіта за стол і падае лыжку французу, кажучы:

— Садзіся, чэлавечэ, пасілкуйся нашай стравай!

Француз маўчаў. Толькі вусны яго трасьліся. Многа цяжкаго перажыў ён за гэты час. Раптам ён кінуўся перад селянамі на калені і расплакаўся.

Убачыўшы гэта, ўсе разам загаманілі:

— Уставай, уставай! Што там!..

І колькі чэлавек, паднаўшы яго, пасадзілі на услоне.

Плакаў француз таму, што ніколі не ждаў, каб тые людзі, каторых ён ішоў паліць і забіваў, так абыйшліся з ім...

Вайна скончылася, многа, многа людзей было перабіта, а ў Слабодцы ніхто і ня ведаў, за што была гэта вайна.

— „Ня лепш жывецца нам і посьле вайны“.—„А французы добры народ“. Казалі старыкі.

Француз не пайшоў дамоў: ён астаўся ў Слабодцы, памагаў Мікіце заместа сына ў рабоці, навучыўся гаварыць па нашаму, лячыў людзей, гуляў з дзяцьмі, і дзеці яго вельмі любілі і звалі „Мікітавым французам“.

**В. П.**

# З усіх старон.

**Пецербург.** Сярод студэнтоў адбываюцца обыскі і арэшты. Градоначальнік загадаў пасадзіць на 2 месяцы 62 студэнтоў, а аднаго на 3 месяцы за незаконнае сабраньне у унівэрсытэці.

= Рада міністроў хочэ прасіць ў Гас. Думы ешчэ 62 мільёны рублёў на помач галодным.

= У Пецербурзе забаставала 1000 доковых работнікоў неўскаго судостраіцельнаго заводу. Яны вымагаюць большай платы і каб выбіраць ім самім стараст.

= Засудзілі на шэсць гадоў у катаргу быўшаго жандарма Пугачова, каторы памыкаўся згвалтаваць сваю дачку.

**Масква.** Хутка ў маскоўскім акружным судзе будуць разбіраць справу князя Урусова, каторы быў калісь міністрам ўнутрэнных спраў. Князь Урусов напісаў кніжку: *«Записки губернатора»* у гэтай кнізе ён кажэ, што кішынёўскі пагром наладзілі кішынёўскіе чорнасоценцы.

**Варшава.** У Варшаві ксёндз Борткевіч залажыў новую веру— сэкту каталікоў-хрысьціян. Новая сэкта вучыць, што ксяндзы павінны быць рэмесьнікамі і зарабляць сабе на хлеб працай. Касьцёльные адправы (імша і др.) павінны адбывацца толькі вечэрам, каб не адрываць людзей ад работы. Сэкта мае ўжо каля 300 чэлавек.

**Рыга.** С прычыны разрыву тарговаго дагавору з Амэрыкай, группа пецербурскіх і рыжскіх капіталістоў згаварылася пабудаваць у Рызе аграмадную фабрыку сельска-гаспадарскіх машын.

**Сыбір.** Рэвізія сыбірскай чугункі, каторую робіць сэнатар Мэдэм, будзе закончэна каля 15 марца. За паўтара году рэвізія выкрыла незвычайные па свайму абшару машэнствы і зладзействы, каторые абыйшліся казьне на дзесяткі мільёноў рублёў. Пацягнуць пад суд каля 500 душ чыноўнікоў.

---

(*Ад ўласных карэспандэнтоў*).

**Пецербург.** Пры унівэрсытэці тутэйшым злажыўся вельмі сымпатычны гурток студэнтоў беларусоў. Гэты гурток мае вельмі добрую мэту: члены яго будуць знаёміцца з жыцьцём беларускаго народу, рабіць навуковые досьледы над яго мовай, абычаямі, песьнямі і др. Трэба знаць народ свой родны, трэба разумець яго душу. А душа народу выліваецца у песьнях, казках, абычаях, мове... Вельмі добрае дзело пачалі рабіць студэнты. Бог ім ў помач! *Лявон*

**Рэвель.** Забаставалі ўсе працоўнікі вагонно-страіцельнаго завода **„Двігатель“**, дамагаючыся увальненьня дырэктара завода, Немчэнко, за тое, што ён бяз віны вывіў пажарнаго стоража, якога пасля прышлося палажыць ў бальніцу; поруч з гэтым рабочые дамагаюцца і лепшай платы за сваю работу.

= Гэтымі днямі марскі ваенны суд засудзіў тутэйшаго сматрыцеля маякоў, Матукайтіса, на год і 4 месяцы у крэпасць за тое, што ён, як выявілося здарэньнем, вельмі многа грабастаў казённых грошэй.

= Тутэйшы газэты друкуюць, што на вострові „Даго“, каторы ляжыць на моры недалёка ад Рэвеля, гэтай вясной аткрыецца вялікая фабрыка шаўкавых вырабоў.

г. **Кірэнск**, Іркуцк. губ. Летам палітычные ссыльные знаходзілі шмат работы каля гораду Кірэнска. Тут працекае вялікая рэка Лена, па ей ходзяць параходы, з гары ў ніз плывуць „паўзкі“, плыты; з іх каля гораду Кірэнска выгружаюць тавары (крам), збожжа, а ў восені на баржы грузяць сена, што ідзе на прыіскі ў Бадайбо. Пачынаючы з вясны аж да восені тут грузяць ешчэ з „манапольки“ гарэлку; адгэтуль яна адпраўляецца мала не па ўсей Лене і на Бадайбо. Вось гэта самая работа і давала хлеб палітычным ссыльным праз ўсё лета. Апрача гэтаго, палітычные тут працуюць на ўсякіх іншых работах: сплаўляюць лес, крам, служаць у магазынах, ходзяць на параходах матросамі, наймаюцца на работы ў полі, але самая глаўная работа дык гэта грузка. Ўсё лета на грузцы працавало каля 15—35 душ, а калі прыймем пад увагу тых, што прыходзілі і атходзілі, то будзе душ сто. На пачатку ў грузчыкоў была свая сталовая (харчоўня) у горадзі: яны хадзілі туды абедаць, ды вячэраць. Начэвалі ўсе за горадам, па вёсках, бо ў горадзі жыць не давала паліція. Хто хацеў жыць ў горадзі, той павінен быў затраціць шмат часу, каб дастаць пазваленьне. Трэба было пісаць губэрнатару прашэньне і т. д. Ды такое пазваленьне і не ахвотна давалі. Вось грузчыкі і маглі толькі абедаць ў горадзі, а ў 8 гадзіне павінны былі пакінуць горад. Але такі лад ня доўга цягнуўся: паліція прыйшла, ўсіх арэштавала і выслала ў воласць, ня гледзячы на тое, што ўсе мелі пашпарты. Пасьля гэтаго ўжо нельга было устроіць сталовай, трэба было варыць абед, там дзе працавалі. Работа грузчыкоў вельмі цяжкая. На такой рабоці трэба было добра харчэвацца, а то ня вытрымаеш да вечэра. Траплялося, што іншые кідалі работу і атхадзілі, бо ня вытрымалі цяжкай працы. Апрача таго трэба ешчэ дадаць, што харчы і на агул ўсё ў гэтай старане надта дарага. Пасьля, як прыйшла зіма, то большая часць асталася без работы і грошэй. *Паддубный.*

---

**Англія.** Лондон схожы цяпер на горад у асадзе. Вельмі быць можэ, што хутка не стане ні хлеба, ні рыбы. Дробные крамы закрываюцца. Забаставала ўжо каля двух мільёноў работнікоў. Затрымалося каля 2 тысяч поездоў. Апрача рудакопоў пачынаюць кідаць работу і іншые работнікі. Гэты рух захапіў і іншые гасударствы: ў Немеччыне забаставалі рудакопы ў Сілезіі. Калі гаспадары не пабольшаць платы, то рудакопы забастуюць ва ўсей Немеччыне.

## Пачтовая скрынка.

**Плюсты**, Субочу.—„Сваты“ не закончэны Апаведаньне павінно мець развязку, а яе у Вас німа. Пішыце больш, прысылайце.

= Адзін з нашых падпішчыкоў пішэ нам: „У беларускіх гарадох німа беларускіх друкаваных кніг. Я быў у Беластоку і у Гродні і нічога не знайшоў. Усюды кажуць, што ніхто іх не пытаецца, а гэта не праўда! Шчырые беларусы! У кожным горадзе у кнігарнях пытайцеся і пытайцеся беларускіх кніжэк і яны паявяцца: іх купяць і паложаць у вакне і усякі тады будзе купляць. Трэба будзіць край! Калі шмат будзе прадавацца беларускіх кніг, тады і сьведомасьць беларуская будзе хутчэй узрастаць“.

= **Гэктор Пад-скі.** „Гутарка мужыка с панам“ добра напісана і друкавалі-б каб можна было, але ня можна. „Пагандляваў“ пачэкаўшы можэ надрукуем, а другіх вершоў друкаваць ня будзем, бо слабые. Просім прысылаць больш, чэкаем.

= **Плаў—ку.** Народные песьні запісываць трэба: 1) нічога не перэменяючы ад сябе ні слоў ні выгавору, 2) запісываць трэба не асобные песьні, а увесь цыкль, гэта значыць, калі вясельные то па парадку, усе вясельные песьні, калі хрэзьбінные, то ўсе хрэзьбінные, так сама весьнянкі, жніўные, купальскіе ды іншые. Пры запісываньні песень трэба кіравацца не граматыкай, а вухам, каб запісаць як раз так, як вухо чуе. Добра так жэ калі хто умее разставіць націскі (ударэньня) над славамі. Запісь беларускіх песень вельмі важная работа, бо гэта фундамэнт пад будучую нашу літэратуру і вялікая заслуга тых, хто пасьвяціць сваю працу на гэту ня лёгкую справу.

Рэдакція просіць усіх нашых чытачоў, каб хто можэ, запісывалі песьні, казкі, прыказкі, загаворы і прыпеўкі. Добра было-б каб апісываючы вясельле зрабіць і фотографію вясельля, хрэзьбін, ды другое.

**К. Олехновічу—Ч.** Вашэ апаведаньне „Сусьветны жаніх і фэральная ноч“, атрымалі, у газэту ён лішне доўгі, сабраўшыся с сіламі мы яго пастараемся надрукаваць у асобнай кніжцы. Пішыце больш і прысылайце.

**Антанёнку.** Пісаць вершы, праўда, не так цяжкая справа, але што-ж калі ня Вы едзеце на сваім вершы, а верш на Вас ездзіць. Ды і страшэнная бедната думак! Трэба больш працаваць над сабой, трэба чытаць кніжкі і не рамансы якіе, а сур'ёзные, навучные кніжкі, каб мець ясны погляд на жыцьцё і на ўсё, што Вас акружае. Трэба думаць больш і ўдумывацца, а калі ўжо думка дасьпее, тады брацца за пяро і пісаць, а так... шкада паперы.

**Падпішчыку Х. Б.** Дзякуем за прыхільнасць. Гэта Вы добра зразумелі, што найбольш зробіць той для нашай сьвятой справы, хто вырабіць сьвядомых людзей, здольных да далейшай працы. І гэта праўда, што беларуса пазнаём па мове, а калі другі хоць і кажэ што ён беларус, але не гаворыць па беларуску, то ў шчырасць яго верыць ня можна, бо ён ужо адрокся сваей мовы, а заўтра можэ адрачыся і народу. Парушэная у № 6 у карэспандэнціі справа сьпевацкіх таварыств, вельмі важная. Вы ў сябе можэце пачаць ад таго, што кожную суботу будзеце збірацца і разам вучыцца сьпеваць хорам, а далей наладзіцца і тэатр і знойдуцца людзі.

## Жарты.

Пятрок ленячыся працаваць на палосцы сваей зямлі, прыстаў ў горадзі за дворніка.

У яго пагасьціў, другі лянюх, Хвядось.

— Ну як-жэ там жывецца Пятру у горадзі?—Спыталі Хвядося ў вёсцы.

— Панам жыве: ходзіць з мятлой, ды ў варотах ноччу стаіць.

— А што-ж ён есць?

— Чай! І сьнедае, і абедае, і вячэрае чаем! Усё чай!

— Ого! каб яго раздуло!

Чаму не хварсіць! Дай нам чаю, і мы панамі паробімся!

* * *

**Начальнік да свайго пісара:** Калі ты будзеш ўсю праўду данасіць, што тут робіцца паміж маіх служачых, то я табе надбаўлю пяць рублёў на месяц.

**Пісар.** Каб ваша ласка ешчэ крыху надбавіць, то і я нешта-б надбавіў... да праўды.

---

Рэдактар-Выдавец

**А. Ўласоў.**

Малады, інтэлігентны беларус акончыўшы 4 клясы прогімназіі

**ШУКАЕ ПРАЦЫ**

Знаю беларускую, расейскую, польскую і трохі францускую мову, знаюся на сельскай гаспадарцы і магу з ахвотай вучыць дзяцей. Пісьмы прашу прысылаць пад адрэсам: **пачт. ст. Міцкуны праз ст. Ново Вілейск**—*Д. Тарашкевічу.*

**Przegląd Wileński**

**Tygodnik polityczny, społeczny i literacki.**

Wychodzi w WILNIE

REDAKCJA i ADMINISTRACJA

*S-to Jerska 15 m. 26.*

**Cena prenumeraty**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Rocznie w Wilnie | 6 r. | z przesyłką pocztową | 7 r. |
| Półrocznie | „ 3 r. | „ | 3.50 k. |
| Kwartalnie | „ 1.50 k. | „ | 1.75 k. |
| Miesięcznie | „ 50 k. | „ | 60 k. |

Kierownik pisma **Ludwik Abramowicz.**

**„DZIENNIK PETERSBURSKI“.**

**Organ kolonii polskich w Cesarstwie Rosyjskiem.**

**Bezpartyjna, polityczna, społeczna, literacka i naukowa gazeta codzienna.**

We wszystkich ogniskach życia polskiego: Warszawie, Krakowie, Lwowie, Poznaniu, Wilnie, Kijowie, jakoteż w ważniejszych miastach Cesarstwa „Dziennik Petersburski“ posiada własnych korespondentów

Wydawca: **A. Babiański.**

Redaktor: **Z. Kmita.**

Sekretarz Redakcji: **S. Grostern.**

Prenumerata wynosi **w Petersburgu:** rocz. **6** rb., półr. **3** rb. **50** k., **Numer pojedyńczy 2. kop.** Na prowincji **3** kop.

**W Cesarstwie:** rocz. **8** rb., półr. **4** rb., kwart. **2** rb., mies. **70** k. **Za granicą:** rocz. **12** rb., półr. **6** rb., kwart. **3** rb., mies. **1** rb.

**Adres Redakcji i Administracji: Petersburg, Włodzimierski prosp. №13.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.